ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

КОШТ НУМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 кап.

РЭДАКЦЫЯ: Калас праспэкт, № 3 паверх, Пакоі 39, 40, 41, 43. Тэлефоны: агульны 2-85, „ рэдактара 14-73, „ сакрат. і к-ры . . 72.

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў . . — р. 80 к. Для ўстаноў . . . . . 1 „ — „ З дадаткам „Чырвоная Беларусь": Для рабочых, служачых і калгасьнікаў . . . 1 „ — „ Для ўстаноў . . . . 1 „ 20 „

Плата за абвесткі: За радок нутыту . . . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . . . 40 „ Пры шматразовым друкаваньні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

№ 114 | Аўторак, 26 мая 1931 г. | № 114

## Гарадзкі сход партактыву

28 мая, а 7 гадзін увечары, у садзе Леніна, адбудзецца партактыў. Даклад аб падзеях у Гішпаніі (дакл. тав. Рыўлін).

Білеты на партактыў атрымаць у гаркоме КП(б)Б.

**Культпроп ГК КП(б)Б.**

# Плянам сяўбы у прыгарадных гаспадарках пагражае зрыў

## Мабілізацыяй усіх сіл рабочых прадпрыемстваў, камсамольцаў, унядрэньнем зьдзельшчыны, сапраўдным шэфствам над каапгасамі папярэдзіць прарывы

## Аб ходзе севу ў прыгарадных гаспадарках

### Пастанова прэзыдыуму гарпрафсавету

Заслухаўшы паведамленьне ЦРК і дырэктараў каапгасаў аб становішчы падрыхтоўкі і ходу сева ў прыгарадных гаспадарках ЦРК, прэзыдыум гарпрафсавету, разам з прадстаўнікамі ФЗМК і дырэктарамі гаспадарак, лічыць падрыхтоўку да сёву **зусім незьдавальняючай**, знаходзячайся пад поўнай пагрозай зрыву. Галоўныя недахопы ў падрыхтоўцы да севу характарызуюцца наступным:

1. Незабясьпечанасьць прыгарадных гаспадарак рабсілай, адсутнасьць зьдзельнай аплаты працы ў гаспадарках і дрэнная арганізацыя працы. Адсутнасьць цьвёрдага пляну пасеву ў большасьці гаспадарак. Зусім слаба, а месцамі і поўнае адсутнічаньне рабочага кантролю над працай прыгарадных гаспадарак.

Безгаспадарчасьць і безадказнасьць з боку дырэктараў гаспадарках. Амаль што поўная адсутнасьць вучоту працы і ходу севу ў гаспадарках. Нерацыянальнае і няпоўнае скарыстаньне цягавай сілы.

Гарпрафсавет канстатуе, што, ня гледзячы на шэраг дырэктыў партыйных і прафсаюзных арганізацый, да гэтага часу няма пералому ў справе мабілізацыі рабочай грамадзкасьці вакол галоўнейшага палітычна-гаспадарчага мерапрыемства—разьвіцьця прыгарадных гаспадарак.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум гарпрафсавету пастанаўляе:

1. У мэтах ліквідацыі прарыву севу і сканчэньня працы да 1-га чэрвеня абвясьціць **дэкаду штурму прарываў** у прыгарадных гаспадарках ЦРК, абавязаўшы ўсе ФЗМК і рабочкомы каапгасаў мабілізаваць увагу ўсіх рабочых, членаў саюзу і іх сямей на барацьбу за сваечасовае правядзеньне севу ў прыгарадных гаспадарках.

Абавязаць ФЗМК пад адказнасьць старшынь штодзённа выконваць кантрольныя лічбы пасылкі рабсілы прыгарадным гаспадаркам у парадку грамадзкай адпрацоўкі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць выконваемай працы.

У трохдзённы тэрмін, разам з рабочкомамі і дырэктарамі гаспадарак, скончыць перавод рабочых прыгарадных гаспадарак на зьдзельную аплату, мабілізаваўшы лепшых працаўнікоў ТНБ прадпрыемстваў для дапамогі ў наладжваньні вучоту зьдзельшчыны, аказаць дапамогу гаспадаркам у разгортваньні працы па сацспаборніцтву і ўдарніцтву сярод рабочых у прыгарадных гаспадарках.

Улічваючы, што фабкомы **«Сьцяг індустрыялізацыі», «Дзьвіна»** нават пасьля апошняй праверкі выкананьня дырэктыў ад 9 мая зусім не павярнуліся тварам да прыгарадных гаспадарак, у выніку чаго садзейнічалі маючымся прарывам у падшэфных гаспадарках імя «Парыскай камуны» і «Новы сьвет», абвясьціць суровую вымову з папярэджваньнем гэтым фабкомам.

Абавязаць праўленьне ЦРК у 24-гадзінны тэрмін скончыць складаньне ўсіх рабочых плянаў пасеву і давесьці гэтыя пляны да кожнага вучастку, брыгады і рабочага прыгарадных гаспадарак.

Мабілізаваць членаў праўленьня ЦРК і членаў гарпрафсавету ў якасьці адказных упаўнаважаных ЦРК і гарпрафсавету па пасеву, прымацаваць іх да асобных гаспадарак да сканчэньня севу.

Абавязаць праўленьне ЦРК пад адказнасьць старшынь праўленьня скончыць не пазьней 20 мая ўсе будуючыяся баракі для рабочых прыгарадных гаспадарак.

Абавязаць праўленьне ЦРК мабілізаваць гарадзкі транспарт ЦРК для перавозкі грузаў у прыгарадныя гаспадаркі з тым, каб усе коні, маючыяся ў гаспадарках, былі поўнасьцю скарыстаны выключна на пасеўную працу.

Адзначаючы недастатковае асьвятленьне ў «Віцебскім Пралетары» становішча прыгарадных гаспадарак і ходу севу, прасіць рэдакцыю „Віцебскага Пралетарыя" безадкладна праз газэту мабілізаваць увагу пралетарскай грамадзкасьці на барацьбу за сваечасовае правядзеньне севу ў прыгарадных гаспадарках.

## Правільна скарыстоўваць рабочую сілу

Востры недахоп рабочай сілы ў прыгарадных гаспадарках ЦРК пагражае сваечасоваму сканчэньню вясновай пасеўнай кампаніі. Пралетарыят гораду, улічваючы гэта становішча, ідзе на дапамогу. Пры правільнай растаноўцы сіл, каапгасы могуць быць цалком забясьпечаны неабходнай ім колькасьцю працадзён. Яककжа да гэтага важнейшага палітычнага пытаньня аднесьліся паасобныя гаспадарнікі і арганізацыі? Трэба сказаць, што ў паасобных выпадках злачынна. Маючаяся рабсіла няправільна скарыстоўваецца. Няма дагаворанасьці—колькі і куды пасылаць, што і дзе рабіць, няма плянавага рэгуляваньня рабсілы.

Аб гэтым сьведчыць абураючы факт, адбыўшыйся ў каапгасе **«Парыская камуна»**, куды зьявілася пяць рабочых фанэрнага завода на дапамогу вясновай пасеўнай кампаніі. Доўга ня думаючы, прадпрыемчывы кіраўнік каапгасу знайшоў для іх работу... на кухні чысьціць бульбу і рыбу. На працягу цэлага дня яны чысьцілі і зьдзіўляліся, задаючы сабе пытаньне: «якія адносіны мае чыстка бульбы і рыбы да вясновай пасеўнай кампаніі? Што думаў гаспадарнік, трудна сказаць».

Ёсьць шмат выпадкаў, калі рабочым, прышоўшым на работу, прыходзіцца па некалькі гадзін сядзець бяз справы, пакуль не дадуць якую-небудзь работу.

Неабходна ўскласьці суровую адказнасьць за правільнае выкарыстоўваньне рабсілы і сваечасовую дагаворанасьць з арганізацыямі аб колькасьці прысылаемых рабочых. Самі рабочыя павінны патрабаваць поўнага выкарыстоўваньня свайго рабочага дня, паведамляючы адпаведныя арганізацыі аб момантах галавацяпскага падыходу да скарыстаньня рабсілы.

**Жыцельзйф.**

## У каапгасе „Новы шлях" зноў небясьпечна

### Сяўба пад ударам. Зьдзельшчыны няма. Культпраца ў загоне

Каапгас **«Новы шлях»** да севу прышоў непадрыхтаваным. Яшчэ на сёньня каапгасу не хапае 217 чал. рабочых. Дрэнна абстаіць справа і з цягавай сілай. Усяго маецца 55 коняй, а нехапае 11. З маючыхся 55 коняй—5—6 стаяць без працы, скалечаныя і хворыя. Хамутамі і цялегамі каапгас забясьпечан. Не хапае насеньня: вікі—100 цэнтн., аўсу—13,5, бульбы—427 цэнтн. Раніўні сеў бульбы зрываецца. Трэба пасеяць 55 га, а на сёньня пасеяна ўсяго толькі 10 га.

На зьдзельшчыну каапгас яшчэ не перайшоў, бо сельска-гаспадарчы аддзел ЦРК толькі 12 мая прыслаў нормы выпрацоўкі. Зараз каапгасу неабходзен адзін трактар.

Работа на полі ідзе без усялякага пляну—наогул плянавасьці няма ва ўсёй працы. Ня створаны брыгады і няма адказных брыгадзіраў. Адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу ў каапгасе шмат, але ён цалком не скарыстоўваецца. Ёсьць выпадкі, што нават сама адміністрацыя ня ведае пляну сяўбы. Тэхнічны дырэктар каапгасу **Ляшчыня** замест выкананьня сваіх абавязкаў выконвае працу табельшчыка. Вылучэнец голкавай фабрыкі **Валейчанка** скарыстоўваецца адміністрацыяй як кур'ер, ня гледзячы на тое, што ён займае пасаду загадчыка гаспадаркі. Таксама ў каапгасе ўсё яшчэ працуе вычышчаны камісіяй па чыстцы **Фрэйман Аўгуст**. Ён падпісвае паперкі за дырэктара Воранава. Наогул трохкутнік каапгасу яшчэ не перабудаваў сваю працу.

Культурна-выхаваўчая і інтэрнацыянальная праца не вядзецца.

Маючаяся насьценгазэта недастаткова асьвятляе ход пасеўкампаніі. Актыў бязьдзейнічае, не дапамагае суседнім новым калгасам. Адміністрацыя каапгасу нерацыянальна скарыстоўвае брыгады. Некаторыя брыгады таксама да працы адносяцца дрэнна. 14 мая працавала брыгада з камтрэсту. 5 чал. з гэтай брыгады пайшлі ў лес і прагулялі цэлы дзень. Вытворчыя нарады ў каапгасе не праводзяцца. Рабочыя прапановы скарыстоўваюцца дрэнна.

Зараз трэба рашуча перабудаваць працу. Рабачком павінен павярнуцца тварам да вытворчасьці. Штаб па правядзеньні севу павінен дапамагаць каапгасу, пасылаючы рэгулярна рабочыя брыгады. Неабходна тэрмінова прарыў ліквідаваць, даўны руйнуючы ўдар па зрыўшчыках севу.

Брыгада «Віцебскага Пралетарыя»—

**Аналовіч. Паляноў.**

## Дапамаглі калгасу

Па ініцыятыве вучняў і рабочых **шчацінай фабрыкі**, 10-га мая быў зроблен выхад ў каапгас „Новы шлях" для дапамогі ў правядзеньні вясновага севу. Праца ішла ўдарным парадкам. Вучні і рабочыя выклікалі адзін аднаго на сацспаборніцтва. Вывезьлі на поле 95 вазоў гною, засеялі 25 га зямлі бульбай, ачысьцілі сад ад гальля, дапамаглі выпусьціць насьценгазэту. Але сярод вучняў нашліся і дэзэртыры, якія не жадалі ісьці ў каапгас, як **Гаўбэр, Вараб'ёў** і інш. Значна дапамагла рабкораўская брыгада «Віцебскага Пралетарыя». Вучні і рабочыя пойдуць яшчэ раз у каапгас для дапамогі.

Брыгада: **Усыскін, Капыскі, Ваўчок, Шмідт.**

## „Для вас няма працы"

16 мая брыгада вучняў **4-й сямігодкі** ў колькасьці 20 чал. была напраўлена **«Культзмычкай»** у каапгас імя **Мопр'у** ў дапамогу правядзеньня севу і палітэхнізацыі, але з боку кіраўніка гаспадаркай **Фаміна** ня было зьвернута дастатковай увагі на брыгаду. Ён, матывіруючы тым, што для брыгады няма працы, адаслаў яе дамоў, сказаўшы, каб больш ня прыходзілі, між тым праца ў каапгасе для вучняў была.

Каму сьлед, трэба зацікавіцца паводзінамі Фаміна.

Брыгада: **Мацэхейн, Мешчаніноў, Карпіцкая і Карбоўскі.**

## Шырока распаўсюдзіць абавязацельствы на сельска-гаспадарчыя машыны

Згодна пастановы СНК СССР ад 16-га красавіка, Сельгасснабжэньнем выпушчаны абавязацельствы на с-г. машыны, якія разьмяшчаюцца сярод калгасаў, нізавых вытворчых каапэрацыйных аб'яднаньняў, індывідуальных бядняцка-сераднякіх гаспадарак, арганізацый спажывецкай каапэрацыі і іншых грамадзкіх арганізацый, якія зьяўляюцца непасрэднымі спажыўцамі сродкаў вытворчасьці сельскай гаспадаркі.

Набыўцы абавязацельстваў маюць права на атрыманьне па іх дэфіцытных с-г. машын, абсталяваньня і тэхнічных матар'ялаў, неабходных для вытворчай работы ў сельскай гаспадарцы на суму трохкратнай каштоўнасьці набытых абавязацельстваў, прычым на дзьве трэціх каштоўнасьці машын і інвэнтару, падпадаючыя пад умовы шкалы крэдытаваньня набыўцам будзе прадастаўляцца вытворчы крэдыт па існуючай шкале крэдытаваньня.

Арганізацыя правядзеньня кампаніі па разьмяшчэньні абавязацельстваў і адказнасьць за сваечасовае выкананьне заданьняў ускладзена на зямельныя органы і сыстэму сельгасзабясьпечаньня.

Прыём падпіскі на абавязацельствы ўскладзен на філіялы даяржбанку, ашчадныя касы, калгасна-каапэрацыйную сыстэму і сыстэму сельгасзабясьпечаньня.

Усе арганізацыі, на якія ўскладзен прыём падпіскі, павінны безадкладна кантрольныя лічбы, атрыманыя імі ад сваіх цэнтраў, давесьці да паасобнага калгасу, нізавога вытворчага аб'яднаньня і сельсавету.

Прымаючы пад увагу тэрмін рэалізацыі абавязацельстваў май—чэрвень, неабходна надаць гэтай кампаніі ударны характар. Арганізацыі, якія разьмяшчаюць абавязацельствы, павінны шырока разгарнуць масавую кампанію, прыцягнуўшы мясцовыя арганізацыі, насьценгазэты, арганізуючы сацспаборніцтва паміж калгасамі і нізавымі вытворчымі аб'яднаньнямі, сельсаветамі і вёскамі, высьвятляючы важнасьць і выгады набыцьця абавязацельстваў.

Падрабязная інструкцыя па разьмяшчэньні падпіскі, а таксама і наменклятуры сельска-гаспадарчых машын, прылад і абсталяваньня, на якія прымаецца падпіска, месцам даны і абвешчаны ў друку, а пагэтаму ўсе арганізацыі, на якія ўскладзена разьмяшчэньне абавязацельстваў, а таксама мясцовыя зямельныя і іншыя органы павінны праявіць максімум сваёй увагі гэтай кампаніі з тым каб заданьне было выканана поўнасьцю і ў тэрмін.

**Б.**

# Працу Гарсавету поўнасьцю падпарадкаваць задачам сацыялістычнага будаўніцтва

## Вышэй узьняць яго баяздольнасьць у справе кіраўніцтва прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай

### ЗАКЛІК РАБОЧЫХ—ШВЭЙНІКАЎ ПАВІННА ПАДХАПІЦЬ УСЯ РАБОЧА-КАЛГАСНАЯ МАСА ВІЦЕБШЧЫНЫ

## Па ўзорнаму перабудуем працу саветаў

### Зварот рабочых і работніц віцебскай швэйнай фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі" да ўсіх рабочых і работніц г. Віцебску

Кампанія па перавыбарах Віцебскага гарсавету сьнежань—студзень прайшла пры надзвычайнай актыўнасьці рабочых мас гораду. Гэта знайшло свой выраз у тым, што яўка на справаздачна - перавыбарчыя сходы была куды больш мінулага году і на многіх прадпрыемствах («Прафінтэрн», ф ка Лекерта і інш.) яўка была 100 проц. Рабочыя фабрык і заводаў зьяўляліся на перавыбары арганізаваным парадкам, дэманструючы за генэральную лінію партыі, за пяцігодку ў чатыры гады, за перабудову працы саветаў тварам да вытворчасьці і калгаснага будаўніцтва. Рабочыя гораду прынялі актыўны ўдзел у абгаварэньні справаздачы гарсавету і да новага наказу ўнесьлі 3 тысячы каштоўных прапаноў. Склад гарсавету складае 75 проц. рабочых, з якіх 60 проц. лепшыя ўдарнікі—барацьбіты за прамфінплян. У час перавыбараў быў створаны тысячны савецкі актыў.

З часу выбараў новага складу гарсавету мінула тры месяцы. Аднак, мы на нашых прадпрыемствах дагэтуль яшчэ ня выканалі дырэктывы партыйных арганізацый аб перабудове работы саветаў—тварам да задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Між тым, сьнежаньскі пленум ЦК УсеКП(б) падкрэсьліў неабходнасьць рашучай і хутчэйшай перабудовы саветаў у адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Пленум паказаў, што для таго, каб забясьпечыць гэтакую перабудову, саветы ва ўсёй сваёй працы павінны на справе абапірацца на створаны ўжо новы масавы актыў і перш за ўсё на ўдарнікаў фабрык і заводаў. Мы-ж гэтае важнейшае пашэньне партыі цалком не ажыцьцявілі, мы ня выканалі тыя абавязкі аб перабудове работы саветаў, якія мы ўзялі на сябе ў час перавыбараў, а менавіта: дэпутацкія групы не на ўсіх прадпрыемствах створаны, а створаныя працуюць вельмі дрэнна, прымацаваны да гарсавету рабочых актыў ня ўцягнуты ў працу гарсавету і яго сэкцый.

Таварышы, віцебскія рабочыя, мы павінны па прыкладу шэрагу перадавых прадпрыемстваў Масквы, Ленінграду, Харкаву і іншых гарадоў, па ўзорнаму перабудаваць працу саветаў, зрабіць іх больш баяздольнымі, дапамагаючы ім пабудаваць сваю працу так, каб яна была цалком падпарадкавана нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Мы, рабочыя швэйнага волату—фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», бярэм на сябе абавязкі рашуча і хутка перабудаваць савецкую працу на фабрыцы.

У нас ужо створан старастат дэпутацкіх груп, якія ўключаюцца ў агульна фабрычную барацьбу за бальшавіцкае выкананьне прамфінпляну, якасьці прадукцыі, гаспадарчага разьліку, рабочага забясьпечаньня і інш.

У нас справа з выкананьнем прамфінпляну абстаіць так:

За першы квартал вытворчы плян выканан на 68,3 проц. Такое недавыкананьне вытворчай праграмы тлумачыцца наяўнасьцю шэрагу вытворчых непаладкаў і адсутнасьцю да 12 студзеня партыйнай і прафсаюзнай афармленай арганізацыі на фабрыцы. Пералом пачынаецца з сакавіка месяца, які быў абвешчан штурмавым. Сустрэчны другога кварталу прапрацоўваўся і ў выніку мы маем выкананьне прамфінпляну ў сакавіку месяцы з сустрэчным—94 проц., а бяз сустрэчнага перавыкананьне.

**За 20 дзён мая мы маем 123,5 проц. Зараз прыступілі да прапрацоўкі сустрэчнага бальшавіцкага пляну для трэцяга кварталу.**

У якасных паказальніках прамфінпляну маем надта невялікія дасягненьні, у выніку чаго абвешчан месячнік паходу за якасьць. Канкрэтна мы бярэм на сябе наступныя абавязкі:

1. Актыўным удзелам у месячніку паходу за якасьць дабіцца зьнішчэньня процанту браку да лічбы, прадугледжанай у прамфінпляне.

2. Перавесьці на гаспадарчы разьлік усе ніжэйшыя гаспадарчыя зьвяньні—агрэгат, вучастак, брыгады.

3. Прапрацаваць зварот ЦК партыі і Саўнаркому аб перабудове спажыўкаапэрацыі і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы для перабудовы працы на аснове звароту нашага ЗРК.

4. У мэтах аўладаньня тэхнікай выпусьціць спэцыяльную пазыку, шляхам якой завербаваць ня менш 550 рабочых. Арганізаваць цэхавыя гурткі па аўладаньні тэхнікай, а ў школе малапісьменных старшага ўзросту ўвесьці курс машыназнаўства.

5. Арганізаваць новыя ўдарныя брыгады імя Віцебскага гарадзкога савету.

6. Поўнасьцю выканаць абавязкі, узятыя намі перад каапэрацыйнымі прыгараднымі гаспадаркамі ў справе засеву і ўборкі ўсёй плошчы і культурнага абслугоўваньня рабочых гаспадарак.

7. Работу падшэфных прыгарадных сельсаветаў перабудаваць тварам да задач сацыялістычнай рэканструкцыі трэцяга году.

8. Замацаваць савецкі актыў, вылучаны ў час перавыбараў гарсавету і вылучыць новы актыў у колькасьці 100 чал. для практычнай працы ў гарсавеце.

9. Вылучыць патрэбную колькасьць лепшых ударнікаў для сацсумяшчальнасьці.

10. Папулярызаваць рашэньні VI зьезду саветаў сярод усіх рабочых.

11. Актыўна дапамагаць справе прасоўваньня пазыкі трэцяга рашаючага году пяцігодкі сярод усіх рабочых, дабіцца поўнага ахопу пазыкай рабочых на месячны заробак.

12. Уцягнуць ва ўкладчыкі ашчадкасы ўсіх рабочых і паставіць узорна працу фабрычнай ашчадкасы.

13. Узмацніць шэфства над вайсковай часткай, ажывіць дзейнасьць асоавіахэмскай арганізацыі на фабрыцы, уцягнуць у яе шэрагі ўсіх рабочых і павысіць іх ваенна тэхнічныя веды.

14. Забясьпечыць абслугоўваньне нацменшасьцяй на іх роднай мове і ўзмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых.

**Мы выклікаем на сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўсе віцебскія фабрыкі і заводы.**

**Няхай жывуць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы работы дэпутацкіх груп!**

**Няхай жыве Віцебскі гарсавет!**

**Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр т. Сталін.**

**Рабочыя і работніцы швэйнай фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі»**

## Прыняць заклік швэйнікаў

Сьнежаньскі пленум ЦК і УсеКП(б), ЦКК і VI Усесаюзны зьезд саветаў рашуча паставілі пытаньне перад саветамі аб перабудове сваёй працы ў адпаведнасьці з задачамі трэцяга рашаючага году пяцігодкі, павярнуўшы работу саветаў тварам да вытворчасьці, тварам да калектывізацыі, зрабіўшы саветы сапраўднымі змагарамі за генэральную лінію партыі, за пяцігодку ў чатыры гады, за калектывізацыю, за пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, за правядзеньне ў жыцьцё ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній.

Пралетарыят Віцебшчыны прыняў актыўны ўдзел у правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету. Гэта кампанія дала прыліў 500 ударнікаў у партыю, 2 тысячы новых ударнікаў, 3 тысячы каштоўных прапаноў рабочых і тысячны рабочы актыў.

Аднак, мы на сёньняшні дзень, ня гледзячы на некаторыя дасягненьні ў рабоце гарсавету, усё-ж работа гарсавету, сельсаветаў і сэкцый цалком тварам да вытворчасьці, тварам да калгаснага будаўніцтва не павярнулася.

Сэкцыі па-ўдарнаму яшчэ не працуюць. Мы маем выпадкі няўдзельнічаньня многіх дэпутатаў і кандыдатаў гарсавету ў рабоце гарсавету і яго сэкцый і асабліва дрэнна абстаіць справа з наведваньнем прымацаванымі пленумаў сэкцый.

**Вось чаму зварот рабочых фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» да ўсіх рабочых і работніц гораду аб перабудове работы гарадзкога савету, павярнуўшы яго сапраўды тварам да вытворчасьці і да калгаснага будаўніцтва мае надзвычайна вялікае палітычнае значэньне.**

Рабочыя і работніцы швэйнага волату «Сьцяг індустрыялізацыі», пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, дабіліся вялізарнейшых посьпехаў у справе выкананьня прамфінпляну, шляхам мабілізацыі рабочых мас, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, сустрэчнага прамфінпляну, і за 20 дзён мая прамфінплян выкананы на 123,5 проц.

Зараз рабочыя і работніцы фабрыкі прыступілі да прапрацоўкі сустрэчнага бальшавіцкага пляну трэцяй квадры і абвясьцілі месячнік паходу за якасьць. Мы ўпэўнены, што рабочыя ф-кі «Сьцяг індустрыялізацыі» і ў далейшым выканаюць вытворчую праграму і праграму трэцяга рашаючага году пяцігодкі наогул.

Рабочыя ф-кі «Сьцяг індустрыялізацыі» цесна ўвязваюць работу гарсавету, сельсаветаў, яго сэкцый, дэпутацкіх груп з усімі палітычна-гаспадарчымі задачамі партыі і ўлады, узяўшы на сябе шэраг канкрэтных абавязацельстваў, якія, бязумоўна, забясьпечаць поўнае выкананьне рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК і VI зьезду саветаў.

Мы павінны зараз гэты зварот швэйнікаў Віцебшчыны давесьці да кожнага рабочага, работніцы, абгаварыўшы гэты зварот на ўсіх сходах, ва ўсіх цэхах і брыгадах.

Гэты зварот павінен садзейнічаць таму, каб усе рабочыя пад кіраўніцтвам партыйных і прафсаюзных арганізацый на мясцох мабілізаваліся на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за новую хвалю сацспаборніцтва і ўдарніцтва, за прыліў лепшых ударнікаў у партыю Леніна, за ўвядзеньне гаспадарчага разьліку ва ўсіх цэхах, за пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, за калектывізацыю і г. д.

Рабкорыя і нізавы друк павінны ў справе папулярызацыі звароту рабочых швэйнікаў адыграць вялікую ролю. Гэты зварот павінен абгаварвацца на рабкораўскіх сходах, аб ім павінны пісаць шматтыражкі і насьценгазэты.

Мы павінны яшчэ і яшчэ раз завастрыць пытаньне перад усімі партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі на мясцох аб большай увазе да работы гарсавету, аб аказаньні большай дапамогі дэпутацкім групам і штодзённым кіраўніцтве імі.

Гэты зварот рабочых швэйнікаў павінен быць стымулам для замацаваньня ўжо маючагася рабочага актыву за гарсаветам і вылучэньня новых лепшых ударнікаў.

Мы ўпэўнены, што зварот рабочых швэйнікаў сустрэне гарачы водгук усіх рабочых Віцебшчыны.

**Н. Дварсон.**

# ТЭЛЕГРАМЫ

## „За рабоча-сялянскую рэспубліку"

### Адозва гішпанскай кампартыі

**ПАРЫЖ, 20.** Гішпанская кампартыя зьвярнулася з адозвай к рабочым і салдатам Гішпаніі. Адозва паказвае, што часовы гішпанскі ўрад служыць капіталізму. Гэты ўрад бязьлітасна пачаў растрэльваць рабочых, якія думалі, што цяперашняя рэспубліка—іх рэспубліка. Растрэльваў для таго, каб абараніць фашысцкія банды і манархічных змоўцаў.

Адозва заклікае рабочых узброіцца, разброіць рэакцыйныя сілы і стварыць саветы рабочых дэпутатаў. Адозва заклікае аб'яднацца з рабочымі і абіраць дэпутатаў у саветы.

Рабочыя і салдаты—заканчвае адозва—змагайцеся за ўзбраеньне пралетарыяту, за саюз з сялянамі, каб дапамагчы ім у іх барацьбе за безадкладны захоп зямлі, за саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, за рабоча-сялянскую рэспубліку.

## Становішча батрака ў Чэхаславакіі

**ПРАГА.** У зьвязку з узмацненьнем эканамічнага крызысу і павялічваючымся ўціскам падаткаў, усё больш цяжкім робіцца становішча сельска гаспадарчага пралетарыяту Чэхаславакіі. Сельгасрабочыя і сяляне беднякі асуджаны на паступовае вымираньне. Зарплата дасягае крыху больш кроны за гадзіну (крона каля 6 кап.).

## Гішпанія купляе савецкую нафту

**ПАРЫЖ. 23.** З Мадрыду паведамляюць, што прадстаўнік нафтасындыкату ў Гішпаніі т. Астроўскі падпісаў з гішпанскім урадам згоду аб пастаўцы ў Гішпанію звыш 1 млн. тон савецкай нафты.

## Камуністычнае самакіраўніцтва гораду дапамагае бастуючым

**ПАРЫЖ. 23.** У Туркуэне адбылася, арганізаваная рэвалюцыйным прафсаюзам тэкстыльшчыкаў, дэманстрацыя 3000 бастуючых. Да дэманстрантаў далучыліся калёны бастуючых з Ронка і Рубэ. Агульны сход унітарных мэталістых Туркуэна пастанавіў далучыцца да забастоўкі. Гарадзкое самакіраўніцтва, у якім большасьць камуністых, адпусьціла бастуючым 100 тысяч франкаў.

## Паравоз на гаспадарчым разрахунку

### Вопыт Акцябрскай дарогі даў добрыя вынікі

У Ленінградзе падведзены вынікі месячнай работы першых паравозных брыгад, што перайшлі на гасразрахунак. Брыгады, прымацаваныя да паравоза № 025323 на працягу месяца с'эканоміл 190 руб. 40 кап.—5 проц. к усёй суме выдаткаў на ўтрыманьне, рамонт і эксплёатацыю паравоза. Брыгада камсамольцаў паравоза № 093174 с'эканоміла 439 р. 12 кап.—15 проц. к агульнай суме выдаткаў. Урэшце брыгада пасажырскага паравоза Л-151 с'эканоміла 631 р. 47 кап.—10 проц. агульнай суме выдаткаў. Брыгады ўсіх трох паравозаў не дапусьцілі перавыдаткаў ні па аднаму з матар'ялаў, прычым каэфіцыэнт скарыстоўваньня манэўровых паравозаў значна павысіўся.

Агляд становішча ўсіх трох паравозаў паказаў, што эканомія дасягнута не ва ўшчэрбак паравозам. Часткі машын знаходзяцца ў добрым становішчы. Брыгады дасягнулі эканоміі, дзякуючы апэрацыйнаму ўліку сваіх выдаткаў. У гэтым—сакрэт эканоміі.

## Сяляне адмаўляюцца ўносіць арэндную плату

**СТАМБУЛ.** Узмацняецца рост рэвалюцыйнага руху сярод сялян Індыі. Памешчыкі, не атрымліваючы арэндной платы, захопліваюць рухомасьць, жывы і мёртвы інвэнтар сялян.

У правінцыі Оўд ужываюць прымусовую працу к няспраўным платнікам арэнды. У той-жа правінцыі сяляне забілі буйнейшага памешчыка, які прыбыў туды для спагнаньня арэнды.

# ПРЭЧ ПРАВАКАЦЫІ ФАШЫСТАУ!

## ПРЭЧ КАРНЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ!

**На новыя выпады польскіх фашыстых рабочыя Віцебску адказваюць яшчэ большым уздымам энтузіязму ў выкананьні прамфінпляну, пасьпяховым сканчэньні бальшавіцкай сяўбы, узмацненьні абароназдольнасьці краіны, паглыбленьні інтэрнацыянальнай і пралетарскай салідарнасьці, масавым уступленьнем у МОПР і дапамогай барацьбітом рэвалюцыі**

## Выканаем пяцігодку ў найкарацейшыя тэрміны

Мы, **рабочыя, служачыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал швэйнай фабрыкі «Прафінтэрн»**, разам з усёй рабочай клясай Савецкага саюзу, пратэстуем супроць новых правакацый польскага фашызму і наглых выпадаў проці краіны саветаў.

У Заходняй Беларусі і Польшчы павялічваюцца нячуваныя бясчынствы і масавыя зьдзекі над рабочымі і сялянамі з боку азьвярэлага польскага фашызму, што знаходзіць сваё выяўленьне ня толькі ў катаваньні арыштаваных рэвалюцыянэраў палёным жалезам, уліваньні вады праз нос і забіваньні шпілек пад ногці, але і прамымі правакацыямі аб кінутых на ст. Падбродзьдзе бомбах быццам-бы рэвалюцыйнымі рабочымі, арганізаванымі для гэтай мэты камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі.

З дню ў дзень працоўныя масы Заходняй Беларусі і Польшчы і арыштаваныя рэвалюцыянэры падвяргаюцца ганеньням і новым рэпрэсіям. Сотні мільёнаў і мільярды злотых выдаткоўваюцца польскім фашысцкім урадам на вайсковыя патрэбы, на атрыманьне паліцыі, дэфэнзыў і турмаў, у той час як для галодных мас рабочых, для пастрадаўшых ад паводкі ўрад ня хоча і не дае ніякіх сродкаў для аказаньня дапамогі. У Савецкім саюзе і ў прыватнасьці ў БССР урад аказаў вялікую дапамогу пастрадаўшаму ад паводкі працоўнаму насельніцтву, вылучыўшы як беззваротную пазыку 993720 пудоў насеньня, 60000 руб., а таксама вылучыўшы спэцыяльны фонд прамтавараў і адпусьціў дармова і па ільготнай цане лес пацярпеўшай ад наводненьня беднаце.

У адказ на наглыя выступленьні азьвярэлага бела-панскага польскага фашызму мы,—рабочыя, служачыя адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал фабрыкі «Прафінтэрн» яшчэ больш згуртуемся вакол ленінскай камуністычнай партыі, каб пад яе кіраўніцтвам працягваць штодзённую гэраічную барацьбу за выкананьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва у найкарацейшыя тэрміны.

Абавязваемся узмацніць штодзённую практычную работу МОПР, аказваць дапамогу зьняволеным рэвалюцыянэрам у капіталістычных турмах, дапамагчы пацярпеўшым ад наводненьня ў Заходняй Беларусі.

Будзем павялічваць свае вайсковыя веды, вывучаць ваенную тэхніку, будаваць паветраны флёт, гэтым самым узмацняючы абароназдольнасьць першай у сьвеце краіны пралетарскай дыктатуры.

Далоў правакацыю фашыстаў!

Рукі прэч ад нацыянальна-вызваленчага руху у Заходняй Беларусі!

Няхай жыве камуністычная партыя і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве чырвоны тыл міжнароднай рэвалюцыі—МОПР!

*

Пасьля мітынгу на фцы **«Прафінтэрн»** быў наладжан масавы збор сродкаў па падпісных лістох у дапамогу палітзьняволеным у капіталістычных турмах.

## Патрабуем спыненьня правакацый

### Вызваліць усіх палітзьняволеных

23 мая на фабрыцы „Сьцяг індустрыялізацыі" адбыўся шматлюдны мітынг пратэсту супроць новай правакацыі польскага фашызму, супроць катаваньняў палітзьняволеных у турмах капіталу.

Мітынг рабочых прыняў наступную рэзалюцыю пратэсту:

Сход рабочых швэйнай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» рашуча пратэстуе супроць новай нахабнай правакацыі польскага фашызму. Новая хлусьня аб кінутых бомбах на ст. Падбродзьдзе мела на мэце разгортваньне кампаніі супроць усяго рэвалюцыйнага руху працоўных Заходняй Беларусі і іх правадыра камуністычнай партыі.

Падрыхтоўваючыся да вайны супроць СССР, польскі фашызм ідзе на самыя жорсткія мэтады белага тэрору.

Мы патрабуем спыненьня гэтых правакацый, вызваленьня ўсіх арыштаваных па падбродзкай справе.

У адказ на новую правакацыю польскага фашызму рабочыя швэйнага волату яшчэ шырэй разгорнуць ударніцкі рух у барацьбе за прамфінплян.

Бальшавіцкімі тэмпамі працы, узмацненьнем абароназдольнасьці краіны, паглыбленьнем інтэрнацыянальнай пралетарскай салідарнасьці, масавым уступленьнем у шэрагі МОПР'у і дапамогай барацьбітам рэвалюцыі мы адкажам на правакацыі белапанскай акупацыі ў Заходняй Беларусі.

Рукі прэч ад нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі!

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне працоўных мас Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі!

# Трохкутнікі бударганізацый не рэагуюць

## НА ІГНАРАВАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ ГарКК-РСІ

### Больш паловы аб'ектаў Белбудаб'яднаньня не забясьпечаны праэктамі

### АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕМ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ЗЬНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ БУДАЎНІЦТВА

## РСІ і пракуратура, за вамі слова

### Прыцягнуць да судовай адказнасьці шкоднікаў будаўніцтва

У свой час «Віцебскі Пралетары» пісаў аб шкодніцтве і безгаспадарчасьці на пабудовах 15-га будаўнічага вучастку Белсельбуду. Ня глядзячы на тое, што газэта патрабавала прыцягненьня да судовай адказнасьці шкоднікаў, РСІ і пракуратура ў гэтым напрамку пакуль што надзвычайна мала зрабілі і **брыдкасьці на будаўніцтве працягваюцца.**

Для будаўніцтва кароўніка абрана зусім нізкае, ня прыгоднае месца. Кароўнік амаль закапаны ў зямлю, а вокны яго знаходзяцца на 1,25 мэтра ад зямлі. Ніякага тэхнічнага нагляду з боку канторы Белсельбуду няма. Летась некалькі разоў на будаўніцтва прыяжджаў інжынэр **Масьленьніка**ў, але ён набіраў у садзе яблыкаў і зноў уяжджаў. Неаднаразова „Віцебскі Пралетары" пісаў аб дзесятніках, якія не будавалі, а шкодзілі.—**Грачухіне, Шалухіне Ц.** і іншых, якія вялі сэрод рабочых контррэвалюцыйныя размовы. За ўвесь час на будаўніцтве перамянілася 7 дзесятнікаў. Дзесятнік **Цярэнцьцеў** дапасаваўся на работу па пратэкцыі і разам з **Бурковым** тварыў махінацыі. **Цярэнцьцеў** перамяніў добрыя пілы будаўніцтва на свае—дрэнныя, ўласныя. Апрача таго, **Цярэнцьцеў і Буркоў** зрабілі зусім няправільную разьбіўку ўнутры кароўніка. Кармушкі пабудавалі ня так як патрэбна і ня там, дзе трэба і зараз іх зноў прыдзецца перабудоўваць. Падлога зроблена вельмі дрэнна. Сілосная вежа мае шмат дэфэктаў, штукатурка фундамаманту ўжо абвалілася, але на гэта ніхто ўвагі не зварочвае.

Ня лепш і на пабудовах Белдзяржбуду. У каапгасе «Новы шлях» два баракі павінны былі быць гатовы 10 мая, але яшчэ ніводзін з іх не гатоў. У адным бараку слалі пол без неабходнай колькасьці падлогавых лат. Прарабы **Лаговір і Крып'ядлоўскі** рэдка бываюць на будаўніцтве. З-за нядбайнасьці Белдзяржбуду, які сваечасова ня скончыў пабудову баракаў, каапгас «Новы шлях» не ўкамплектаваны рабочай сілай.

РСІ і пракуратура павінны зараз-жа ўмяшацца ў гэтую справу, прыцягнуўшы да судовай адказнасьці сьвядомых шкоднікаў будаўніцтва.

Ударная брыгада «Віцебскага Пралетарыя»—**Акаловіч, Палякоў.**

## Будаўнічыя арганізацыі працуюць старымі тэмпамі

Яшчэ ў студзені гарКК-РСІ дала дырэктывы аб падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону. Але будаўнічы сэзон захапіў шмат арганізацый зьнянацку—яшчэ не заключана большая частка дагавароў з работадацелямі (аддзяленьне будаб'яднаньня на пабудову ФЗВ швэйнай фабрыкі, будкантора не заключыла дагаворы па 5 ці аб'ектах, камтрэст па 6-ці).

Аб'екты будаўніцтва разьмеркаваны паміж бударганізацыямі бяз уліку іх працаздольнасьці і фінансавай магутнасьці. З прычыны гэтага атрымалася, што будаб'яднаньне мае праграму на **18 аб'ектаў на суму 3.723 тысячы руб.**, а аддзяленьне Белбудканторы, значна ніжэй стаячае па сваёй фінансавай базе і будаўнічым вопыце мае праграму па **36 аб'ектах на суму 6.906 тысяч руб.** Па шэрагу аб'ектаў будаўніцтва яшчэ не адведзены вучасткі зямлі (ФЗВ швэйнай фабрыкі), не дасьледван грунт на будаўніцтве ясьляй, тэлефоннай станцыі аэрадрому, інтэрната вэтінстытуту, пэдінстытуту, пажарнага дэпо і інш.; ня ўлічаны памылкі мінулых год, калі пабудаваныя памяшканьні на недасьледваных вучастках давалі трэшчыны, у выніку чаго патрабаваўся грунтоўны рамонт.

Недапушчальным зьяўляецца адсутнасьць праэктаў. Па аддзяленьні Белбудаб'яднаньня дагэтуль няма праэктаў на палову аб'ектаў частка маючыхся не высунуты яшчэ ні на тэхнічнае, ні на грамадзкае абгаварэньне, у выніку чаго часам прыходзіцца спыняць работы з-за значных пераробак (біржа працы). Большая частка бударганізацый не распрацавалі календарна-вытворчых плянаў работ па асобных галінах будаўніцтва, **самацёкам ідзе вярбоўка і забясьпечаньне рабсілай і нарыхтоўка будматар'ялаў.** Па камтрэсту зусім не наладжана вярбоўка рабсілы па асобных кваліфікацыях, бэтоншчыкаў, землякопаў і інш., не навербавана ніводнага чалавека, у выніку чаго ўжо ёсьць зрыў работы (цагельны завод). Маецца таксама ажыятаж у вярбоўцы рабочых—Белбудканторы вербавала рабочых-каменшчыкаў у Гомелі з гарантыяй па 7 р. у дзень пры паменшанай норме выпрацоўкі, чым сарвала вярбоўку рабсілы будаб'яднаньню.

Будаўніцтва яшчэ ў большасьці залежыць ад выпадковай колькасьці матар'ялаў і тэрмінаў іх атрыманьня. Некаторыя матар'ялы маюцца ў нязначнай колькасьці, дадзеныя заяўкі не рэальныя. Белбудканторай упушчаны сарыяючыя ўмовы для нарыхтоўкі мясцовых матар'ялаў, з прычыны чаго маецца павышэньне каштоўнасьці матар'ялаў і спазьненьне. На асобных аб'ектах будаўніцтва няма адзінаначальля і адказных за работу.

**Недапушчальна ігнаруюцца дырэктывы аб мэханізацыі.** Белбудканторай нічога ня зроблена ў гэтай галіне ня толькі практычна, але нават не распрацаваны пляны мэханізацыі.

Бударганізацыі дагэтуль карыстаюцца яшчэ старымі расцэнкамі і апошнія сыстэматычна парушаюцца. Зноў распрацаваныя ўсебеларускія расцэнкі яшчэ не атрыманы.

Пры ўсіх гэтых прарывах з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый да будаўніцтва праяўлена паўнейшая недаацэнка, многія з іх не аказаліся на чале разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, не мабілізавалі ўвагу мас на выкананьне буйнейшых задач па будаўніцтву.

Патрэбен безадкладны пералом. Трэба выявіць вінаватых у зрывах і прыцягнуць іх да строгай адказнасьці.

**Жыцельзэйф, Матусаў, Баснін.**

## Рацыянальна скарыстаць сталярную майстэрню

Пры Белбудаб'яднаньні маецца мэханізаваная сталярная майстэрня, якая мае нагрузку толькі да 40 проц., а будкантора і камтрэст выбываюць вялікія сталярныя работы самастойна самым першабытным чынам, у той час, калі майстэрня будаб'яднаньня магла-б цалком абслугоўваць і гэтыя арганізацыі. Будкантора прымушана пасылаць у гомельскую майстэрню частку сваіх сталярных работ, што каштуе надзвычайна дорага і апрача таго бываюць частыя псоты і паломкі пры перавозцы гатовых вырабаў.

Кожны гаспадарнік самастойна набывае буд'матар'ялы і паміж імі канкурэнцыя стала звычайным зьявішчам. Маюцца і такія факты, калі ў адной арганізацыі скапляюцца і ляжаць без усялякай карысьці вялікія запасы лесаматар'ялаў, а ў другой аранізацыі яго няма. Прыходзіцца плаціць у два разы больш і апрача таго тармозіцца сваечасовае разгортваньне будаўніцтва.

Такое становішча далей працягвацца ня можа. Неабходна зараз-жа вырашыць пытаньне аб арганізацыі адзінай сталярнай майстэрні, абсталяванай па апошняму слову тэхнікі, якая абслугоўвала-б усе бударганізацыі. Апрача таго, неабходна паставіць пытаньне аб арганізацыі адной будканторы, якая-б магла весьці і плянаваць будаўніцтва, што дало-б эканомію і рацыянальнае скарыстань не будматар'ялаў.

**Слова за адпаведнымі аргамі зацыямі.**

**Столяр.**

## Аднаразовы збор на патрэбы жыльлевага будаўніцтва

Для ўзмацненьня разгортваньня рабочага жыльлёвага будаўніцтва ў адпаведнасьці з хуткім ростам колькасьці рабочага складу ЦВК і СНК Саюзу ССР пастанаўляюць:

Увесьці на 1931 г. аднаразовы збор на патрэбы жыльлёвага будаўніцтва. Зборам абкладаюцца ўсе грамадзяне, маючыя самастойныя крыніцы прыбытку. Плацінікі падзяляюцца на пяць катэгорый: 1) рабочыя і служачыя, асобы, атрымліваючыя прыбыткі ад літаратурнай і навуковай работы, каапэраваныя саматужнікі і рамесьленьнікі, 2) некаапэраваныя саматужнікі і рамесьнікі, работаючыя бяз ужываньня наёмнай працы, 3) некаапэраваныя саматужнікі і рамесьнікі з колькасьцю наёмных рабочых ня больш трох і іншыя асобы, абкладаемыя прамысловым падаткам па цьвёрдых стаўках, 4) уласьнікі будынкаў, 5) уласьнікі гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў і іншыя асобы, маючыя непрацоўныя даходы.

Ад уплаты зборaў вызваляюцца грамадзяне, аднесеныя да першых трох катэгорый, калі іх заробак не перавышае 75 р. у месяц, прыцягнутыя ў 1931 г. к абкладаньню адзіным сельскагаспадарчым падаткам, ваенна-служачыя кадравага, радавога і начальствуючага складу, пэнсыянэры, вучні і інш.

Збор узімаецца ў залежнасьці ад месячнага прыбытку абкладаемага і складае 8 руб. для асоб, аднесеных к першай катэгорыі з заробкам да 100 р. у месяц, да 30 руб.—для асоб гэтай-жа катэгорыі з заробкам да 300 руб. Каэфіцыэнт разьмера збору для астатніх чатырох катэгорый у дачыненьні да першай складае: 1,5, 2, 3 і 5. За заробак звыш 300 руб. апрача асноўнай стаўкі, уносіцца адпаведная процантная надбаўка для першай катэгорыі 12 проц. і г. д.

Збор уплачваецца ў два тэрміны: асобамі, што аднесены да першай катэгорыі—пры атрыманьні заробку за першую палову чэрвеня і ліпеня 1931 г. іншымі платнікамі—да 15 чэрвеня і да 15 ліпеня 1931 г.

Збор паступае ў агульна-саюзны бюджэт, 25 проц. паступленьня збору адлічваецца ў мясцовыя сродкі.

Інструкцыя па дапасаваньні гэтай пастановы выдаецца Наркамфінам СССР.

## Дэзэртыры сацыялістычнага будаўніцтва

Групы менскіх і віцебскіх рабочых, прапрацаваўшы на Магнітабудзе некаторы час, адтуль ганебна дэзэртыравалі.

Рэдакцыя атрымала пастанову агульнага сходу рабочых і служачых арганізацыі Стальмост, што працуе на Магнітабудзе.

«Заслухаўшы інфармацыю аб дэзэртырак менскай і віцебскай групы з будаўніцтва вялізарнейшага волату пяцігодкі Магнітабуду, агульны сход рабочых і служачых Стальмоста ганьбіць дэзэртырскі ўчынак вышэйназваных рабочых і як дэзэртыраў працоўнага фронту перадае іх таварыскаму суду, аднаасова выключыўшы з саюзу».

У адказ дэзэртырам, рабочыя і служачыя замацаваліся да канца будаўніцтва волата і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсіх рабочых і служачых Магнітабуду.

Вось прозьвішчы дэзэртыраў і лятуноў, якія, пагнаўшыся за доўгім рублём, пакінулі важнейшы вучастак сацыялістычнага будаўніцтва:

**Дворкін Міхась, Будо Мікола, Цёмкін, Робінчук, Паняцюк Ул., Голубь, Канцлер, Шмыкаў і інш.**

## Агляд мясцовай прамысловасьці правесьці пры самым шырокім удзеле грамадзкасьці

ЦКК-НК РСІ, ВСНГБ, ЦСПСБ і НКФ пачалі агляд становішча мясцовай прамысловасьці БССР і выкананьня дырэктыў партыйных і вышэйшых урадавых органаў.

Мясцовая прамысловасьць, падпарадкаваная РВК і гарсаветам, за апошнія гады прайшла шлях шпаркага развіцьця. Дырэктывы партыі і ўраду аб разгортваньні ў БССР прамысловасьці, базіруючайся на мясцовай не дэфіцытнай сыравіне знайшлі сваё асаблівае пераламленьне па лініі мясцовай прамысловасьці. Некалькі лічбаў характарызуюць разьвіцьцё мясцовай прамысловасьці: валавая прадукцыя складала ў 28—29 г. **15,2** міл. альбо ўзрост супроць 27—28 г. на 45,4 проц., а ў 29—30 г.—**5,9** міл. руб.—узрост на 70 проц. супроць 28—29 г.

Рабсіла складала ў 28—29 г.—4632 чал., у 29—30 г.—да 7321 чал.

Разгортваньне мясцовай пр-ці ў 1931 г. характарызуецца наступнымі асноўнымі паказальнікамі:

Валавая прадукцыя па цэнах 26—27 г.—**67,4** міл. р. альбо рост супроць 29—30 г. **на 160 проц.**

Рабсіла—8191 чал. сталых і 7862 сэзонных, альбо адпаведны ўзрост супроць 29—30 г. **на 57,5 процанту і 139,4 процанту.**

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што мясцовая прамысловасьць зьяўляецца адным з важных сэктараў усёй народнай гаспадаркі БССР.

Між тым увага, якая удзяляецца гэтаму сэктару народнай гаспадаркі, як з боку цэнтральных плянірующых устаноў, гэтак і на мясцох—яўна не выстарчальная і патрабуе каранного пералому.

Спэцыфічныя ўмовы мясцовай прамысловасьці, а менавіта яе раскіданасьць, наяўнасьць у кожным раёне у адным падпарадкаваньні шэрагу розных галін вытворчасьці, складанасьць яе эканамічнага і галоўнае, тэхнічнага кіраўніцтва, патрабуюць асаблівай прапрацоўкі і значнай арганізацыі.

Пачынаемы агляд ставіць мэтай вывучэньня як на мясцох, гэтак і ў цэнтры шэраг важнейшых пытаньняў: як выконваецца дырэктыва партыі і ўраду ў адносінах разьвіцьця мясцовай прамысловасьці, ступень скарыстаньня мясцовых сыравінных рэсурсаў, напрамак разьвіцьця асобных галін прамысловасьці і г. д. Такія пытаньні, як плянаваньне і тэхнічнае кіраўніцтва, формы кіраўніцтва мясцовай прамысловасьці—інструктаж і сувязь цэнтральных устаноў з раёнамі, арганізацыйная структура ў цэнтры і на мясцох, гэтыя пытаньні асабліва пасьля ліквідацыі акруг і перанясеньня цэнтру усёй работы ў раён патрабуюць вывучэньня і вырашэньня, бо ад гэтага ў значнай ступені залежыць пасьпяховасьць работы мясцовай прамысловасьці. Пляны, якія складаліся, не прашлі міма рук шкоднікаў і гэта зараз адчуваецца. Ужо да агляду высьвятляецца «тэхніка» плянаваньня, дрэннае гэаграфінае разьмяшчэньне мясцовай прамысловасьці, не эфектыўнасьць шэрагу капітальных укладаньняў. Сьвядомае тармажэньне разгортваньнем торпараспрацовак і пераводу мясцовай прамысловасьці, пажыраючай шмат вугалю і дроў, на тарпяны апал і шэраг інш. момантаў.

Значнае месца ў пачынаемым аглядзе займае праверка работы самі "прадпрыемстваў, як выканан і выконваецца прамфінплян па колькасных і якасных паказальніках. Аналіз саміх плянаў, тэхніка іх складаньня, давядзеньне іх да кожнага рабочага, як уводзіцца гаспадарчы разрахунак і вынікі дагаворнай кампаніі, пытаньні крэдытнай рэформы. Скарыстаньне усіх вытворчых магчымасьцяў прадпрыемства і становішча з мабілізацыяй унутраных рэсурсаў, камплекс пытаньняў эканамічнай і масавай працы: сацспаборніцтва, ударніцтва, вынаходзтва, рацыяналізацыя, скарыстаньне рабочых прапаноў, пераход на 7-гадзінны рабочы дзень, бесьперапынны рабочы тыдзень, становішча з аховай працы зарплатай, падрыхтоўкай кадраў рабочых і тэхнічных, пастаноўка вучоту і справаздачнасьці, ход капітальнага будаўніцтва і падрыхтоўка да 1932 г.—усё гэта жыцьцёвыя моманты работ усёй прамысловасьці і кожнага прадпрыемства паасобку. Для мясцовай прамысловасьці пытаньні патрабуюць асабовага высьвятленьня і зруху, бо фактычна да апошняга часу большасьць прадпрыемстваў не працавала на гаспадарчым разрахунку.

Строгі гаспадарчы разрахунак, плянаваасьць, справаздачнасьць, точнасьць дагэтуль яшчэ не ў пашане ў значнай частцы гаспадарнікаў мясцовай прамысловасьці. Па маючыхся права-апартуністычных разважаньнях аб тым, што мясцовая прамысловасьць ня можа вытрымаць такой дысцыпліны, якая зараз патрабуецца, ёй гэта не пад сілу таму, што яна адстала яшчэ па параўнаньні з рэспубліканскай, ссылка на адсутнасьць кадраў і інш., трэба будзе рашуча ўдарыць.

І, нарэшце, пытаньні кіраўніцтва мясцовай прамысловасьцю і ўдзел у яе рабоце гарсавету, сэкцый, прафарганізацый.

Пасьпяховае правядзеньне гэтага важнага агляду залежыць ад ступені і дапамогі брыгадам з боку мясцовых кіруючых органаў і ступені ўдзелу ў аглядзе шырокай рабочай масы, прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці.

Пры мабілізацыі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці для гэтага агляду вышэйшыя ўрадавыя і дырэктыўныя органы змогуць на грунце больш поўных матар'ялаў намеціць правільныя далейшыя шляхі разьвіцьця мясцовай прамысловасьці.

**Ізакоў.**

